


**ПРУДОК** (да 1938 г. Вусаўка) – вёска ў Беладубраўскім сельскім Савеце, за 23 км на ПдЗ ад Касцюковіч і чыгуначнай станцыі Камунары на лініі Крычаў – Сураж, 183 км ад Магілёва, на р. Бесядзь (прыток р. Сож), на ПдЗ мяжуе з лесам. Транспартныя сувязі па прасёлачнай і далей па аўтадарозе Саматэвічы – Касцюковічы, 4 гаспадаркі, 6 жыхароў (2007). Археалагічны помнік – гарадзішча, якое размешчана за 0,3 км на паўднёвы захад ад вёскі, сведчыць, што гэтыя мясціны былі заселены людзьмі ў глыбокай старажытнасці. Вёска вядома з 1799 г., 12 двароў, 111 жыхароў, уладанне памешчыка. Па рэвізіі 1833 г. в. Прудок пры р. Бесядзь. 53 сялянскія душы, уладанне памешчыцы Саламеі Гайковай. У 1873 г. уладальнікам фальварка калежскім саветнікам Хахловым была заснавана сукнавальня. У 1878 г. заснавана канатна-вяровачная вытворчасць, даход з якой складаў 1200 руб. У 1897г. пазначана як вёска Прудок (яна ж Вусаўка), 261 жыхар, у Саматэвіцкай воласці Чэрыкаўскага павета. Побач быў аднайменны фальварак – 1 двор, 3 жыхары. Адносіліся да Саматэвіцкага праваслаўнага прыхода. У 1909 г. в. Прудок (яна ж Вусаўка) на паштовым тракце, 35 двароў. Належала мясцоваму сельскагаспадарчаму таварыству; яна валодала 160 дзесяцінамі зямлі. Побач размяшчаўся фальварак, 1 двор, 8 жыхароў, 72 дзесяціны зямлі. Апошнім уладальнікам быў дваранін Зянковіч. У 1919 г. была адкрыта пачатковая школа, у якой у 1925 г. навучалася 42 вучні. З 20.08.1924 г. вёска ў Саматэвіцкім сельскім Савеце Касцюковіцкага раёна Калінінскай, з 09.06.1927 г. Магілёўскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., вёска; 58 двароў, 316 жыхароў. У 1931 г. вяскоўцы ўступілі ў калгас “Пераможац”. У 1940 г. 77 двароў. У верасні 1943 г. акупанты поўнасцю спалілі вёску, усе 77 двароў. Пасля вайны адбудавалася. У брацкай магіле, што ў цэнтры вёскі, пахаваны 21 воін 269-й стралковай дывізіі 3-й арміі Бранскага фронту, якія загінулі 28.09.1943 г. у баі за вызваленне вёскі. Паводле перапісу 1959 г. –



217, у 1970 г. – 137 жыхароў. У 1986 г. 33 гаспадарк
саўгаса “Саматэвічы”, працаваў магазін. Планіроўка
пераважна двухбакова, няшчыльна драўлянымі сялян
Пд ад вёскі размешчана радовішча гліны. Радзіма I
Ігнаценкі, літаратара, члена Саюза пісьменнікаў Белар

У 1991 г. жыхары вёскі перaселены ў пасёлак
Новыя Саматэвічы.



Р.К. Ігнаценка